# З Новым годам, сябры!

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі Універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 39 (239) | Пятніца, 31 снежня 1976 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.




Дарагія сябры! Адыходзіць у гісторыю яшчэ адзін год — 1976-ы. Гэта быў год XXV з'езда КПСС, які вызначыў новыя планы па далейшаму будаўніцтву камуністычнага грамадства ў нашай краіне, першы год юбілейнай, дзесятай пяцігодкі. Мы папрацавалі добра — народная гаспадарка атрымала ад ГДУ сотні маладых спецыялістаў, значныя навуковыя распрацоўкі на рахунку нашых вучоных, многае зроблена па ўдасканальванню вучэбна-метадычнай і ідэйна-выхаваўчай работы.

Мір, праца, шчасце — гэтыя словы спадарожнічалі нам у прайшоўшым годзе, дапамаглі падняцца на ступеньку вышэй, вызначыць новыя планы і больш высокія рубяжы.

Няхай жа ў працы і вучобе заўжды спадарожнічае вам поспех, няхай кожны пражыты дзень прыносіць карысць любімай Айчыне!

Жадаем вам новых поспехаў, моцнага здароўя, вялікага шчасця!

ПАРТКОМ, РЭКТАРАТ, МЯСЦКОМ, КАМІТЭТ ЛКСМБ, ПРАФКОМ.

## АБ ТЫМ, ШТО ХВАЛЮЕ СТУДЭНТАЎ

Другі навучальны год пры парткоме існуе інфармацыйная група. У яе састаў уваходзяць кіраўнікі адміністрацыі, прадстаўнікі партыйнага, мясцовага, камсамольскага і прафсаюзнага камітэтаў. Члены групы перыядычна наладжваюць сустрэчы са студэнтамі, у час якіх ідзе размова аб усім тым, што хвалюе будучых спецыялістаў.

У мінулую пятніцу інфармацыйная група правяла пасяджэнне ў інтэрнаце № 2. Чытальная зала не ўмясціла ўсіх жадаючых прысутнічаць на гэтай сустрэчы.

Перад жыхарамі ўніверсітэта выступіў рэктар, член-карэспандэнт АН БССР, дэпутат Вярхоўнага Савета Беларускай ССР Б. В. Бокуць. Барыс Васільевіч расказаў аб рабоце чацвёртай сесіі Вярхоўнага Савета БССР дзевятага склікання, якая нядаўна праходзіла ў Мінску, аб перспектывах развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі ў дзесятай пяцігодцы. Ён расказаў і аб тым, якім стане праз пяцігодку наш універсітэт, адказаў на шматлікія пытанні.

У гэты вечар былі закрануты праблемы студэнцкага быту і многія іншыя пытанні. На іх адказвалі сакратар парткома У. В. Казлоў, прарэктар па АГР В. І. Конухаў, старшыня прафкома Н. І. Колтышава.

Сустрэча інфармацыйнай групы са студэнтамі яшчэ раз засведчыла вялікую карысць аналагічных мерапрыемстваў.

## З ДОБРЫМ НАСТРОЕМ

Весела, з добрым настроем святкуюць Новы год у нашым універсітэце. 25 снежня выкладчыкі і супрацоўнікі ГДУ правялі ва ўніверсітэцкай сталовай навагодні «Агеньчык», які надоўга застанецца ў памяці ўсіх яго ўдзельнікаў. 28 снежня ў актавай зале адбыліся святочныя навагоднія вечары біялагічнага факультэта і факультэта фізічнага выхавання, у галоўным корпусе — фізічнага і гісторыка-філалагічнага факультэтаў. 29 снежня адзначылі навагодняе свята студэнты-эканамісты. У чацвер, у актавай зале ўніверсітэта праходзіў ...чаўніверсітэцкі Навагодні баль.

60-ГОДДЗЮ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!

## ЗА ПРАВА ПАДПІСАЦЬ РАПАРТ

Вось ужо каля двух месяцаў запар пераможцай у спаборніцтве за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка ў групе Т-44 становіцца Таццяна Калініна. І гэта невыпадкова. Сістэматычная падрыхтоўка да заняткаў, актыўныя выступленні на семінарах дазваляюць ёй адной з усёй групы не мець незалікаў.

Таццяну ведаюць і як актыўнага члена студэнцкага навуковага гуртка, удзельніцу грамадскага жыцця групы, факультэта. Два гады яна была камсоргам групы, затым — старшынёй ВВК эканамічнага факультэта. Цяпер Таня займаецца ў школе маладога лектара.

Таццяна Калініна — чулы таварыш, заўсёды прыходзіць на дапамогу сваім сябрам. Камсамольцы групы аднадушна назвалі яе кандыдатам падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола ЦК КПСС.

В. ЧАРНЕНКА,
камсорг групы Т-44.

